# МІР. ПЕРАМОГА . МАЙ

***Прадстаўнікі ВДУ заўсёды прымаюць удзел у прымеркаваных да дзяржаўных святаў мерапрыемствах, што праходзяць у горадзе і вобласці. Так адбылося і ў пачатку мая, калі Рэспубліка Беларусь адзначала 77-ю гадавіну Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга. Святы ў гэтым годзе набылі асаблівае значэнне, бо 2022-гі абвешчаны Годам гістарычнай памяці.***



7 мая супрацоўнікі і студэнты ВДУ сталі ўдзельнікамі аўтапрабегу «Шляхамі вайны – шляхамі Перамогі». Машэраўцы наведалі патрыятычны комплекс «Дзісненскі рубеж», прысвечаны памяці салдат Чырвонай Арміі – абаронцаў Полацка; Курган Бессмяротнасці (Полацк), гарадскі пасёлак Расоны, дзе ўжо ў жніўні 1941 года была створана падпольная група «Дубняк», кіраўніком якой стаў П.М. Машэраў; аграгарадок Клясціцы, дзе размешчаны помнік героям 1812 года. Фінішнай кропкай маршрута стала вёска Роўнае Поле. Там знаходзіцца мемарыял у памяць партызанскай брыгады Ракасоўскага, камісарам якой быў Пётр Машэраў, і музей партызанскага быту, створаны на месцы былога партызанскага лагера. Студэнты ВДУ прадставілі выставу «Старонкі ваеннай біяграфіі П.М. Машэрава» і расказалі цікавыя факты пра тое, як Пётр Міронавіч змагаўся ў партызанскім атрадзе.

**Фота- і відэарэпартаж з аўтапрабегу глядзіце з дапамогай QR-кода.**

* * *

8 мая ў скверы імя Леніна адбыўся мітынг, прысвечаны Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, на якім прысутнічалі студэнты і супрацоўнікі нашага ўніверсітэта. Жыхароў горада вітаў старшыня Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў Уладзімір Бялевіч, які нагадаў, што герб і сцяг – гэта галоўныя атрыбуты дзяржаўнасці, што менавіта яны з'яўляюцца ўвасабленнем нашай нацыянальнай ідэі, асновай суверэнітэту і незалежнасці. Пра важнасць і значнасць галоўных атрыбутаў дзяржаўнасці нашай краіны расказала студэнтка 3 курса педагагічнага факультэта ВДУ, сакратар моладзевай палаты пры Віцебскім гарадскім Савеце дэпутатаў Анастасія Ярошчанка.

* * *

Тысячы жыхароў і гасцей Віцебска на 9 мая ўтварылі вялізную калону і прайшлі ад плошчы Леніна да плошчы Перамогі. Людзі неслі партрэты сваякоў – салдат, партызан і падпольшчыкаў, сцягі, кветкі, паветраныя шары. Супрацоўнікі, выкладчыкі і студэнты ВДУ на чале з рэктарам Валянцінай Багатыровай занялі пачэснае месца ў калоне. Машэраўцаў, дзякуючы форме афіцэраў ваеннай кафедры і студэнтаў, што там навучаюцца, было бачна здалёк.

Пасля ўрачыстага шэсця адбыўся мітынг, у якім прынялі ўдзел кіраўніцтва вобласці і горада. Яны першымі ўсклалі вянкі і кветкі да вечнага агню Мемарыльнага комплексу ў гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў. Як адзначыў старшыня абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Субоцін, у традыцыях беларускага народа не толькі абараняць Айчыну, але і захоўваць памяць пра сваіх продкаў. Мы, беларусы, як ніхто ведаем кошт міру – у рэспубліцы падчас вайны загінуў кожны чацвёрты, на Віцебшчыне – кожны трэці.

Пасля заканчэння ўрачыстай часткі машэраўцы ўсклалі кветкі да вечнага агню і зрабілі фатаграфію на памяць каля Мемарыльнага комплексу ў гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў.

**Фота- і відэарэпартаж са святкавання Дня Перамогі глядзіце з дапамогай QR-кода.**

**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**



